КАМСАМОЛЬЦЫ, ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ! НАСТОЙЛІВА АВАЛОДВАЙЦЕ МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКАЙ ТЭОРЫЯЙ, ВЫШЫНЯМІ НАВУКІ, ТЭХНІКІ І КУЛЬТУРЫ! БУДЗЬЦЕ Ў ПЕРШЫХ РАДАХ БАРАЦЬБІТОЎ ЗА ПАСПЯХОВАЕ ВЫКАНАННЕ РАШЭННЯЎ XXIV З'ЕЗДА КПСС!

(З Заклікаў ЦК КПСС да 1 Мая 1971 года).

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 16 (811) ● Чацвер, 29 красавіка 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

УНІВЕРСІТЭТ ПЕРАДСВЯТОЧНЫ

Універсітэт напярэдадні Першамая. Чым жывуць факультэты, што робіцца цікавага, з чым ідуць яны да свята, як мяркуюць яго правесці!

Свята вясны нельга ўявіць без яркіх і прыгожа афармленых калон дэманстрантаў. У гэтым годзе аб'яўлен конкурс на лепшае афармленне факультэцкай калоны.

ВЕЧАРЫ. Іх будзе вельмі многа. Шмат і старанна працуюць над праграмай свайго вечара філолагі. На ім выступяць са сваімі ўражаннямі студэнты з Японіі, Францыі, з краін Афрыкі, якія праходзяць у БДУ стажыроўку. Потым адбудзецца канцэрт калектыву мастацкай самадзейнасці факультэта, які заняў першае месца ва універсітэцкім аглядзе.

Біёлагі запрасілі да сябе дэлегатаў рэспубліканскіх камсамольскіх з'ездаў. Гутарка пойдзе пра вынікі Ленінскага заліку, пра паспяховасць.

СУСТРЭЧЫ. У мінулыя суботу і нядзелю нашымі гасцямі былі студэнты Гомельскага універсітэта. На сцэне БДУ выступіў творчы калектыў гамяльчан. Госці пазнаёміліся з факультэтамі універсітэта, наведалі мемарыяльны комплекс Хатынь.

Цікавай была сустрэча школьнікаў Слабодзінскай школы Стаўбцоўскага раёна з іх шэфамі, студэнтамі факультэта прыкладной матэматыкі. Шэфы расказалі пра універсітэт, свой факультэт. Затым яны выступілі з вялікай канцэртнай праграмай. Студэнты перадалі школьнікам сабраную бібліятэчку.

КАФЕДРА ТЭАРЭТЫЧНАЙ ФІЗІКІ. Паспяхова прайшла ў перадсвяточныя дні абарона кандыдацкай дысертацыі аспірантам кафедры Нгуен Ван Тхоа.

В. ЯЦЭВІЧ.

УЗНАГАРОДЫ ЗА ПОСПЕХІ

Радасныя весткі прыходзяць у перадсвяточныя дні ў наш універсітэт. Асабліва прыемныя яны для фізічнага, геаграфічнага і юрыдычнага факультэтаў. За высокія паказчыкі, дасягнутыя ў ходзе выканання сацыялістычных абавязацельстваў, узятых у гонар XXIV з'езда, гэтыя калектывы ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР. Такой высокай узнагароды ўдастоены і кафедры гісторыі КПСС гуманітарных і прыродазнаўчых факультэтаў, ваенная кафедра, кафедры педагогікі і псіхалогіі, мікрабіялогіі, гісторыі журналістыкі, эканамічнай геаграфіі СССР, фізічнай геаграфіі зарубежных краін, грамадзянскага права і працэсу, фізікі паўправаднікоў, радыёфізікі і электронікі ЗВЧ, а таксама адміністрацыйна-гаспадарчая частка, бібліятэка, выдавецтва. Гэтым жа калектывам уручаны пераходныя вымпелы рэктарата, парткома і мясцкома універсітэта.

Граматамі міністэрства ўзнагароджаны таксама філалагічны, хімічны, падрыхтоўчы факультэты і шэраг аддзелаў.

Дзесяць кафедр універсітэта, вучэбная частка, даведніцка-бібліяграфічны аддзел бібліятэкі і наборны цэх друкарні ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі рэктарата, парткома і мясцкома БДУ. Такога гонару ўдастоены і многія супрацоўнікі універсітэта. 110 з іх узнагароджаны Ганаровымі граматамі, 182 — граматамі, а 90 — аб'яўлена падзяка.

ПРЫСВЕЧАНЫ ЛЕНІНУ

ДЗЕНЬ нараджэння У. І. Леніна — свята для ўсіх людзей. Кожны рыхтуецца і адзначае яго па-свойму. У студэнтаў у гэты дзень такія ж заняткі, як і заўсёды: лекцыі, практычныя. Па раскладу ў другакурснікаў журфака — замежныя мовы. Аднак выкладчыцы англійскай мовы вырашылі аб'яднаць групы на ленінскі ўрок.

Спачатку студэнты расказалі на англійскай мове аб дзяцінстве, юнацкіх гадах Ільіча, аб тым, як ён працаваў над стварэннем Камуністычнай партыі ў нашай краіне, аб жыцці за мяжой. А потым усе ўважліва слухалі любімыя музычныя творы У. І. Леніна: рэвалюцыйныя песні, санаты Бетховена. Ніхто не хацеў разлучацца з цудоўнымі гукамі «Апасіянаты», і таму яе слухалі тры разы.

А потым некаторыя студэнты падзяліліся ўспамінамі аб сваіх паездках па ленінскіх мясцінах.

Разыходзіліся ўсе ў сапраўды святочным настроі.

Н. МЫЛЬЦАВА,
студэнтка.

ПА ДАРОГАХ ПЕРШАМАЯ

Сталіца будзе яшчэ ў святочным убранні, калі з плошчы Леніна крануцца матацыклы і аўтобус з удзельнікамі агітпаходу «БДУ-50». Маршрут яго пройдзе праз Стаўбцы, Нясвіж, Салігорск, Мазыр, Рэчыцу, Быхаў, Оршу, Барысаў. Пасланцы БДУ пабываюць на фабрыках, заводах, шахтах, у школах і калгасных клубах.

Мы правядзём гутаркі па матэрыялах XXIV з'езда КПСС, раскажам аб ролі БДУ ў развіцці навукі і культуры рэспублікі, аб тым, якія кадры рыхтуе наш універсітэт, аб 50-гадовай гісторыі старэйшай навучальнай установы і аб універсітэце сённяшніх дзён.

Мы сустрэнемся з заслужанымі настаўнікамі рэспублікі, героямі вайны і працы, з людзьмі, якім універсітэт даў путёўку ў жыццё. Нас чакаюць сустрэчы з рабочымі Аршанскага льнокамбіната, шахцёрамі Салігорска, з рэчыцкімі нафтавікамі. Мы адчуем подых працоўнага жыцця, убачым росквіт прамысловасці і будаўнічы размах рэспублікі-гераіні.

Лекцыі аб рашэннях XXIV з'езда партыі і развіцці беларускай навукі за 50 год, аб гісторыі універсітэта, які носіць імя У. І. Леніна, прачытаюць дацэнты кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў Г. Г. Герасіменка і В. А. Баркан. Аб патрыятычным выхаванні моладзі раскажа генерал-маёр у адстаўцы А. В. Кірсанаў. Будуць прачытаны таксама лекцыі для навучэнцаў сярэдніх школ аб профілях падрыхтоўкі спецыялістаў у БДУ, аб рабоце універсітэцкіх арганізацый моладзі.

Пакажуць сваё майстэрства працоўным рэспублікі і школьнікам удзельнікі эстраднага ансамбля, якім кіруе Валодзя Эфрон.

Узначальвае агітбрыгаду загадчык кабінета кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў Уладзімір Белакосаў. На яго рахунку не адзін паход. У мінулым годзе ён правёў рэспубліканскую агітбрыгаду ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна па складанейшаму маршруту Мінск—Шушанскае. Нялёгкімі будуць дарогі і для ўдзельнікаў двухтыднёвага агітпаходу «БДУ-50», якія працягнуцца на 1.500 км.

Наш паход прысвячаецца 50-годдзю універсітэта, святу не толькі выкладчыкаў, студэнтаў і ўсіх, хто працуе ў яго сценах і выйшаў адсюль, каб аддаць свае веды людзям, навуцы, а ўсёй Беларусі. Аб усім цікавым, з чым сустрэнуцца ўдзельнікі агітпаходу, раскажа універсітэцкая шматтыражка.

Л. ЕКЕЛЬ,
удзельнік агітпаходу, спец. кар. газеты «Беларускі універсітэт».

Ідуць заняткі ў студэнтаў III курса біялагічнага факультэта. Лекцыю па жывёлагадоўлі чытае доктар біялагічных навук прафесар Васіль Мікалаевіч КАРЭЛІН.

Фота **Д. Чаховіча.**

УНІВЕРСІТЭТ ПЕРАДСВЯТОЧНЫ

● **Дні матэматычнага факультэта сталі ўжо традыцыйнымі. Штогод у канцы красавіка да нас на факультэт прыязджаюць дэлегацыі з многіх універсітэтаў Савецкага Саюза, каб прыняць удзел ва ўрачыстасцях. Вельмі шырокай была праграма сёлета.**

Ва ўрачыстасцях прынялі ўдзел дэлегацыі Ужгародскага, Днепрапятроўскага, Вільнюскага, Тартускага універсітэтаў. Госці агледзелі кафедры і лабараторыі матфака, славутасці нашай сталіцы, наведалі Беларускі тэатр імя Я. Купалы, мемарыяльны комплекс Хатынь і Курган Славы.

Як заўсёды, да гэтых дзён прымяркоўваецца пасвячэнне першакурснікаў у студэнты. Таму многае ў праграме было разлічана на самых малодшых матэматыкаў. Асабліва цікавай была сустрэча студэнтаў першага курса з буйнешымі вучонымі БССР. Перад студэнтамі выступіў ветэран матфака прафесар А. Х. Турэцкі, які вельмі цікава расказаў аб гісторыі факультэта. Уважліва слухалі юнакі і дзяўчаты выступленне нашага выпускніка, маладога вучонага, кандыдата фізіка-матэматычных навук Ю. І. Макавоза. Яго расказ быў прысвечан сучаснай матэматыцы і выдатным дзеячам гэтай галіны навукі.

Прыемнае ўражанне пакінула выступленне ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці факультэта. Многія нумары выконваліся на «чыста матэматычнай мове». Затым быў заключан «дагавор» паміж дэканатам і першакурснікамі тэрмінам на пяць год. Яго на сцэне падпісалі дэкан факультэта А. А. Гусак і староста першага курса А. Самадураў.

П. ВАКУЛЬЧЫК,
намеснік сакратара камітэта камсамола матфака.

● **У мінулую нядзелю група выдатнікаў і актывістаў універсітэта вярнулася з арганізаванай прафкомам універсітэта заахвочвальнай паездкі ў сталіцу Літоўскай ССР.**

Студэнты азнаёміліся з выдатнымі мясцінамі г. Вільнюса, пабывалі ва універсітэце, у мастацкай галерэі, на славутай Замкавай гары, а таксама ў новых мікрараёнах горада.

Т. ФЕДАРЦОВА.

...І ЎСЕ ЗА АДНАГО

Іх ДВАЦЦАЦЬ ТРЫ. А з'яднаны яны студэнцкім жыццём, аптымізмам, жывой цікавасцю як да сусветных падзей, так і да клопатаў, трывог кожнага члена іх невялікага калектыву. Раўнадушных тут знайсці цяжка. Здаецца, зусім няма такіх сярод юнакоў і дзяўчат трэцяй групы IV курса факультэта прыкладной матэматыкі.

Мікалай Труш, сакратар камітэта камсамола факультэта, дарэчы, выхаванец гэтай жа групы, расказвае:

— Трэцяя група IV курса адна з самых моцных, баявых і актыўных у нас. Вядома, што факультэт наш зусім малады. Усю грамадскую работу давялося наладжваць нанава. Спраў было непачаты край. І першымі памочнікамі былі пераважна студэнты гэтай групы. Многія з іх выступалі перад першакурснікамі, уводзілі ў курс нашага студэнцкага, камсамольскага жыцця, вучылі праводзіць сходы, складаць планы работы.

Добрых спраў на рахунку студэнтаў - чацвёртакурснікаў III групы шмат. Кожны яе камсамолец мае грамадскае даручэнне. Прычым звычайна гэтыя даручэнні ніхто не навязвае. Бо тут актывісты ўсе. Кожны сам, улічваючы свае магчымасці, прапаноўвае і робіць тую альбо іншую карысную справу, як, напрыклад, прафорг Люда Мазанік. Яе аднакурснікі гаварылі, што Люда ўсёй душой хвалюецца за групу, за факультэт. Многа ў яе грамадскіх абавязкаў. У кожнай, нават самай малой справе Людміла ўмее знайсці нешта важнае, цікавае, захапляючае. І за што ні бярэцца яна, усё робіць з ахвотай, з любоўю.

— Прымаючы сацыялістычныя абавязацельствы,— гаворыць камсорг Оля Калініна, — мы вырашылі афарміць стэнд, прысвечаны ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнтаў нашага факультэта. Люда Мазанік добраахвотна ўзялася за гэтую справу і зрабіла выдатны стэнд.

Займаецца Людміла ўвесь час паспяхова. Улюбёна ў матэматыку. Цікавіцца кожнай навінкай у гэтай галіне навукі. Ды і не толькі ў гэтай.

— Вельмі каштоўныя якасці ёсць у характары Люды, — дадае Калініна. — Яна вельмі душэўны, абаяльны чалавек. У аднакурснікаў карыстаецца вялікім аўтарытэтам. Многія знаходзяць у ёй чулага, надзейнага таварыша, друга, з якім можна смела падзяліцца і няўдачай і радасцю.

Як прафорга Люду заклапочвае размеркаванне стыпендый і месц у інтэрнаце. Яна ведае матэрыяльнае становішча кожнага ў групе. Меў рацыю Валерый Муляр-чык, калі нядаўна на Ленінскім заліку сказаў пра Л. Мазанік, што яна з'яўляецца ўзорам для прафорга, для актывіста.

Такіх, як Людміла, у групе шмат. У кожнага ёсць свае захапленні, інтарэсы, якія супадаюць з інтарэсамі агульнымі, грамадскімі. А гэта дапамагае рабіць студэнцкае жыццё жывым, цікавым, карысным. Так, на факультэце створан студэнцкі вылічальны цэнтр, які выконвае гаспадарча-дагаворныя работы. Актыўнымі яго членамі з'яўляюцца Анатоль Мяцельскі і Мікалай Іваноў (ён жа і кіраўнік стралковага гуртка на ФПМ). Валянцін Бандарэнка і Валерый Няпахаў — члены зборнай універсітэта па хакею. Вядома, і іх уклад ёсць у тым, што хакейная каманда факультэта прыкладной матэматыкі выйшла на другое месца ў спаборніцтвах сярод хакеістаў БДУ. Валерый Громак выступае за універсітэт па гандболу.

Для Анатоля Мяцельскага, мабыць, самым галоўным з'яўляецца навуковая работа. Ён узначальвае на факультэце студэнцкае навуковае таварыства.

А вось Жэпю Чаголіну хвалюе зараз іншае. Яна кіруе шэфскім сектарам у камітэце камсамола.

— Нашы падшэфныя — вучні першай школы Мінска. Мы рэгулярна праводзім з імі заняткі ў гуртках, выконваем шмат іншай шэфскай работы. Цяпер рыхтуемся да матэматычнай віктарыны, якую мяркуем правесці ў маі.

Вось такімі справамі сустракаюць рабяты з ФПМ свята вясны.

Дзякуючы Мікалаю Трушу, Людзе Мазанік, Олі Калінінай, Валерыю Мулярчыку, Васілю Ігнаценку, Лілі Ганчарык, Толю Мяцельскаму і многім іншым, сацыялістычныя абавязацельствы ў групе выкананы з гонарам. Ленінскі залік здалі ўсе камсамольцы групы. Прытым 8 — на выдатна. Дарэчы, круглых выдатнікаў вучобы тут ледзь не палова. «Хвост» — гэта сапраўднае ЧП для калектыву. І не дзіўна, што III група IV курса заняла ў мінулым семестры II месца па паспяховасці на ФПМ. У надыходзячай сесіі рабяты мяркуюць працаваць яшчэ больш старанна. Пажадаем жа ім поспехаў.

А. АЛЕКСАНДРОВІЧ.

У кабінеце гісторыі СССР. Фота Д. Чаховіча.

ПА ІСПАНСКАЙ—ВЫДАТНА

— Добры вечар,— па іспанску віталі прыходзіўшых гаспадары — гісторыкі і географы. Яны — арганізатары вечара, прысвечанага 51 гадавіне Камуністычнай партыі Іспаніі.

Студэнты, якія вывучаюць іспанскую мову, збіраюцца на такія вечары ўжо некалькі гадоў запар.

Вечар адкрывае выкладчык іспанскай мовы Іван Іванавіч Навіцкі.

Потым слова бярэ былы ўдзельнік грамадзянскай вайны ў Іспаніі, цяпер дацэнт інстытута замежных моў Хасэ Марыя Флорэс Фернандэс. Ён пранікнёна расказвае аб барацьбе Камуністычнай партыі Іспаніі на ўсіх этапах яе развіцця.

Госць студэнтаў успамінае былое, сваю першую сустрэчу з вялікай Краінай Саветаў і новыя баі са зброяй у руках супраць фашызму ў Вялікай Айчыннай вайне.

Да мікрафона падыходзяць вядучыя — студэнты III курса гістфака Тоня Філіповіч і Алег Яноўскі. На выдатнай іспанскай мове яны віншуюць Хасэ Марыю Флорэс Фернандэс з яго святам — 51 гадавінай іспанскай Кампартыі, а потым аб'яўляюць праграму вечара. Патрэбна заўважыць, што ўся яна была пабудавана на шырокім выкарыстанні іспанскай мовы. Нават звычайны паштальён тут зваўся па-іспанску, і пісьмы было дазволена пісаць толькі па-іспанску. Усе гульні вяліся з улікам асаблівасцей іспанскіх слоў. Аб гэтым раней паклапаціўся І. І. Навіцкі. Што яго навучэнцы добра ведаюць мову, было бачна кожнаму.

Смех, жарты... Вось хлопцы чытаюць вершы Гарсіа Лоркі. Не вытрымаў і таксама выйшаў і прачытаў вершы свайго юнацтва, вершы, якія некалі вялі ў бой, Хасэ Марыя Флорэс Фернандэс. Бурна апладзіравала яму моладзь. Трапіўшы ў яе кола, ветэран і тут адчуў сябе маладым, і вось ён кружыцца ўжо ў танцы.

Непасрэднасць, шчырасць былі прыемнымі асаблівасцямі гэтага вечара і разам з добрай арганізацыяй і прадуманай праграмай зрабілі яго выдатнай з'явай у студэнцкім жыцці.

Ужо к канцу вечара праходзіць хваляванне ў Вані Русакова і Георгія Шапавала — непасрэдных арганізатараў усёй «тэхнічнай» і гаспадарчай часткі вечара. Яны задаволены.

Вечар заканчваецца. Разыходзяцца з вясёлым гоманам студэнты. Заўтра заняткі па іспанскай, і я ўпэўнен: адзнака ў кожнага будзе — выдатна!

В. ДРАЗДОЎ,
студэнт.

КАНЦЭРТ - ПАДАРОЖЖА

Кафедра рускай мовы падрыхтоўчага факультэта правяла ў актавай зале тэматычны вечар «Краіна, у якой мы жывём». Гэта было нібы своеасаблівае падарожжа в'етнамскіх студэнтаў па нашай неабсяжнай краіне.

Студэнты падрыхтавалі да вечара песні і вершы на рускай мове аб нашай Радзіме, аб савецкім народзе. Хор в'етнамскіх студэнтаў выканаў «Песню аб Леніне» С. Тулікава і «Песню аб дружбе» А. Астроўскага. Ву Тхі Хонг прачытала верш К. Сіманава «Радзіма». Так пачаўся канцэрт. А на экране адначасова дэманстраваліся кінакадры аб шырокіх прасторах нашага краю, выкарыстоўваліся і дыяпазітывы.

Музычнае падарожжа пачалося з Ленінграда. Гучаць радкі верша В. Пракоф'ева «Горад Леніна». На экране слаўны горад на Няве. Затым прысутныя перанесліся ў сталіцу нашай Радзімы Маскву. Іх суправаджае мелодыя песні «Масква майская». Група в'етнамскіх студэнтаў выконвае песню «14 мінут да старта».

А потым на экране—шырокая руская рака Волга. Мы чуем мелодыю песні «Цячэ Волга». Далей удзельнікі вечара «наведваюць» горад-герой Волгаград. Ле Дзінь Фук выконвае песню Р. Панамарэнкі «Расце ў Волгаградзе бярозка», а Ву Чунг Хыу — песню Б. Фрэнкеля «Рускае поле». Муй Суан Хай чытае верш С. Шчыпачова «Клянёмся!»

А вось і неабсяжныя стэпы Казахстана. Іх ужо нельга аддзяліць ад камсамольцаў-цаліннікаў. Бадзёра гучыць мелодыя песні «Едуць навасёлы», якую выконвае група в'етнамскіх студэнтаў.

Сібір магутная... І так дарэчы тут песня «Расцвітай, Сібір».

А потым уся зала падхоплівае «Песню аб трывожнай маладосці» А. Пахмутавай.

Цераз сівы Урал удзельнікі вечара накіроўваюцца на сонечны Каўказ. Гучыць «Песня аб Тбілісі».

Праз усю Украіну падарожнікі вяртаюцца ў Беларусь. Хуінг Хыу Фонг чытае верш П. Броўкі «Прысяга сэрца». На экране — Мінск. А ў зале — «Песня аб Мінску» У. Алоўнікава.

У заключэнне гучыць песня «З чаго пачынаецца Радзіма» В. Баснера з кінафільма «Шчыт і меч» у выкананні Во Тхань Хунга.

У канцэрце прыняў удзел дзіцячы ансамбль Мінскага палаца культуры прафсаюзаў «Равеснік», які дапаўняў песні і вершы, падрыхтаваныя да канцэрта в'етнамскімі студэнтамі, танцамі народаў СССР.

Вечарам былі задаволены ўсе: і студэнты, і актывісты інтэрклуба Мінскага палаца піянераў і школьнікаў, і рабочыя камвольнага і тонкасуконнага камбінатаў, і вучні-старшакласнікі сярэдніх школ № 1 і № 2 гор. Мінска, што былі запрошаны на вечар.

З няменшым задавальненнем намеснік дэкана падрыхтоўчага факультэта У. М. Стрэльчанка і загадчык кафедры рускай мовы Т. П. Плешчанка дзякавалі выкладчыцам факультэта Г. Г. Валохінай і М. А. Івановай, пад кіраўніцтвам якіх в'етнамскія студэнты падрыхтавалі такі цудоўны, арыгінальны і непаўторны вечар.

М. ДЗЯДКОВА.

Кожны вясенні дзень — гэта набліжэнне сесіі, і таму ўсё большае месца ў вучэбным раскладзе адводзіцца практычным заняткам.

НА ЗДЫМКУ: на занятках па іспанскай мове адказвае студэнтка II курса журфака Л. ЛАГОТКА.

Фота А. НОВІКАВА.

НА ЗЯМЛІ ЯНТАРНАЙ

Па запрашэнню Калінінградскага універсітэта група членаў НСТ факультэта журналістыкі пабывала ў Калінінградзе на студэнцкай навуковай канферэнцыі. Гарача сустракаў камсамол зямлі янтарнай сяброў з Мінска, Вільнюса, Рыгі, Баку, Ташкента, Петразаводска і іншых гарадоў.

Хто аднойчы пабываў у Калінінградзе — запомніць яго надоўга. Гэта горад кантрастаў: маленькія домікі з высокімі дахамі з чырвонай чарапіцы і новыя сучасныя карпусы, брукаваныя вузкія вулачкі і шырокі Ленінскі праспект.

Мы стаялі ў задуменні ля помніка Аляксандру Касмадзям'янскаму, разважалі аб сэнсе жыцця ля магілы Канта.

Студэнцкая навуковая канферэнцыя — важная падзея ва універсітэце. У гэты дзень няма заняткаў. Пасля пленарных паседжанняў пачынаюць работу секцыі. Руплівa працуюць хімікі, біёлагі, фізікі, прававеды. Секцыя літаратуры падзялілася на дзве падсекцыі: рускай класічнай і савецкай літаратуры. Тэматыка дакладаў цікавая і разнастайная. Каштоўна тое, што задавалася шмат пытанняў і гасцям і гаспадарам. Абмеркаванне праходзіць сур'ёзна, удумліва.

Вечарам — выніковае пленарнае паседжанне. Уручаюцца ўзнагароды. Прыемна атрымаць падарунак ад сяброў.

Л. ПЕРАСЫПКІНА,
студэнтка II курса.

НЕ СТАРЭЮЦЬ СТУДЭНТЫ

Што гэта? Форум навуковых работнікаў? Канферэнцыя выкладчыкаў? Але вельмі ўжо вясёлая атмасфера пануе тут, ажыўлены гул не змаўкае ні на хвіліну.

Даволі салідныя як па знешняму выгляду, так і па ўзросту людзі запоўнілі 24 красавіка універсітэцкую актавую залу. Гэта не проста гледачы, гэта — студэнты! Нехта з іх быў студэнтам пяць год назад, нехта 10—15, а хто і 20—25. Яны сабраліся сюды, каб адзначыць 40-годдзе ўтварэння хімічнага факультэта, сустрэцца з былымі аднакурснікамі.

— Вельмі прыемна, што выпускнікі не губляюць з намі сяброўскіх сувязей, — наведваюць факультэт, — гавораць дэкан хімфака Фёдар Мікалаевіч Капуцкі, — Я з задавальненнем паведамляю вам, што наш факультэт значна вырас за апошнія гады і займае другое месца па колькасці студэнтаў. Калі пры нараджэнні факультэта на ім было толькі 2 кафедры, то цяпер іх —9.

Шмат у гэты вечар было сярод хімікаў і дзелавых размоў і жартаў. Адміністрацыя факультэта многае зрабіла для таго, каб вечар быў удачным, каб выхаванцы факультэта зноў адчулі харaство незабыўных студэнцкіх год. Выпускнікам была разаслана анкета. Падлічана на аснове 153 адказаў, што сёмая частка хімікаў працуе ў школе, дзве сёмыя—у інжынерна-тэхнічнай сферы і чатыры сёмыя—навуковыя работнікі.

Першае месца па «працавітасці» заняў член-карэспандэнт АН БССР, выпускнік 1952 года прафесар І. М. Ярмоленка, які апублікаваў больш 200 работ. Другое месца прысудзілі члену-карэспандэнту АН БССР, доктару хімічных навук А. А. Шлыку. Прызёраў узнагародзілі падарункамі. Па даных анкет былі зроблены вельмі цікавыя, дасціпныя падлікі, абвяшчэнне якіх выклікала вясёлую рэакцыю залы. Так, напрыклад, на аднаго выпускніка прыходзіцца 11 навуковых работ і 1,1 дзіцяці.

Пасля слова далі былым студэнтам. І няхай многія з іх — маці і бацькі, бабкі і дзядулі, у іх сардэчных словах адчуваўся юначы студэнцкі задор. А выступленні заслужанай настаўніцы БССР Н. Н. Беліч, выпускніцы 1940 года кандыдата хімічных навук І. А. Бушуевай, выпускніка 1941 года дырэктара завода эндакрынных прэпаратаў Г. А. Рабцава і многіх іншых аб'ядноўвала адно — гарачыя словы ўдзячнасці роднаму факультэту.

Л. ЦІТОВА.

ПРЫЕМНАЯ СУСТРЭЧА

Нядаўна ў інтэрнаце № 6 адбыўся канцэрт заслужанага артыста БССР Іосіфа Пятровіча Лакштанава.

Канцэрт быў невялікі, але за гэты кароткі час Іосіф Пятровіч расказаў некалькі фельетонаў, гумарэсак, выканаў прыпеўкі і эстрадную мазаіку, якая асабліва спадабалася слухачам.

А. ГРУДАВА, студэнтка I курса філфака.

У навуковай чытальнай зале бібліятэкі. **Фота Д. Чаховіча.**

ПЯТРО ГАЕБКА І УНІВЕРСІТЭТ

«У нашай сям'і ўсе мужчыны, у тым ліку і бацька, — успамінае Пятро Глебка, — былі пісьменнымі — умелі распісацца і чытаць па складах друкаваны тэкст. Гэта было прадметам маёй дзіцячай зайздрасці, і я ўсімі сіламі рваўся ў школу. Можа тут была і своеасаблівая хітрасць: вучыцца мне здавалася ўсё ж такі лягчэй, чым у золкую восень пасвіць статак, а зімой ганяць яго на вадапой, рэзаць сечку і трэсці трасянку. Так ці іначай, вучыцца я хацеў вельмі».

У школу паэт пайшоў у 1914 годзе. У адным класе вышэйша-пачатковага вучылішча з Пятром займаліся будучыя беларускія пісьменнікі П. Трус і А. Якімовіч. Неўзабаве школу рэарганізавалі ў сямігодку, якую Пятро Фёдаравіч скончыў у 1923 годзе. Не толькі ў пачатковай школе, але і ў сямігодцы беларуская літаратура была любімым прадметам паэта. Тым больш, што ў сямігодцы стварылася пэўнае літаратурнае асяроддзе. Некаторыя выкладчыкі школы пісалі вершы і апавяданні і знаёмілі з імі сваіх вучняў. Тут напісаў свой першы верш і П. Трус.

Услед за ім П. Глебка і сам пачынае спрабаваць сілы ў літаратуры. Заахвочваў яго да гэтага і той факт, што колішнія аднакласнікі А. Якімовіч і П. Трус, якія вучыліся цяпер у Мінскім педагагічным тэхнікуме, ужо друкаваліся і неўзабаве сталі членамі літаратурнага аб'яднання «Маладняк». Глебка гэтым часам змяшчаў свае вершы ў школьным часопісе «Вір», быў старшынёй вучнёўскага камітэта.

Перад сканчэннем Пятром сямігодкі школу наведаў адзін з адказных работнікаў Наркамасветы БССР. Глебка ад імя вучняў выступіў на сходзе, чытаў свае вершы. Ён быў прадстаўлены як «паэт і самы здольны вучань». Прадстаўнік паабяцаў паклапаціцца аб яго далейшай вучобе. Пасля выпускных экзаменаў будучы паэт з пасведчаннем аб сканчэнні сямігодкі едзе ў Мінск паступаць у БДУ. Але тут яго сустрэла няўдача. На экзаменах па грамадазнаўству ён атрымаў здавальняюча, а па матэматыцы «праваліўся нашчэнт»: «У мяне спыталі пра біном Ньютана, а я ніколі не чуў, што гэта такое».

Пятро Глебка вярнуўся дадому. Яго выбралі сакратаром сельсавета. Тут ён прайшоў першую школу грамадскай работы. Але прага да ведаў, любоў да літаратуры не пакідалі паэта. І ў 1924 годзе ён паступае ў Мінскі педагагічны тэхнікум і з натхненнем аддаецца навуцы. Сярод выкладчыкаў быў народны паэт Я. Колас. У тэхнікуме вучыліся П. Трус, А. Якімовіч, М. Лужанін, А. Александровіч, С. Дарожны, З. Бандарына і многія іншыя маладыя беларускія пісьменнікі. Тэхнікум часта наведвалі і выступалі перад студэнтамі К. Крапіва, К. Чорны, М. Зарэцкі. Пры тэхнікуме працавала літаратурная студыя «Маладняка». Я. Колас часта на вечарах і на лекцыях чытаў студэнтам свае новыя творы, і пад уплывам яго творчасці фарміраваліся многія маладыя пісьменнікі.

З трэцяга курса педтэхнікума Пятро Глебка пераходзіць на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Пра гэты час паэт успамінаў так: «Фарміраванню маіх літаратурных поглядаў значна спрыяла навучанне ў БДУ, у які я перавёўся з педтэхнікума ў 1927 годзе. Там я больш глыбока пазнаёміўся з класічнай рускай і замежнай літаратурай, з агульнай гісторыяй, з асновамі марксізма-ленінізма. Для мяне з кожным годам усё больш яснымі станавіліся мае літаратурныя шляхі і задачы».

Ва універсітэт Глебка прыйшоў ужо тады, калі выйшаў у свет яго першы зборнік вершаў «Шыпшына» (1927 г.). Гэтая кніга мае шматлікія адзнакі вучнёўства, творчай няспеласці, рыторыкі. Што ж, паэт толькі ўступаў у вялікую літаратуру, і вучыцца яму патрэбна было многа і настойліва.

Студэнцкія гады — надзвычай важны і плённы этап у творчым фарміраванні пісьменніка. Яны вызначаюцца шчырым і настойлівым імкненнем тэарэтычна асэнсаваць некаторыя актуальныя праблемы сучаснага яму літаратурнага жыцця. Творчы рост паэта супадаў з вялікімі зрухамі і дасягненнямі ў жыцці і псіхалогіі народных мас — усё гэта пашырала творчыя далягляды пісьменніка, уздымала грамадзянскі патрыятычны пафас усёй яго творчасці, надавала ёй характар вострай надзённасці і актуальнасці.

Ды і ва універсітэце было пэўнае літаратурнае асяроддзе, якое спрыяла яго літаратурнай дзейнасці. Толькі на адным курсе з Глебкам вучыліся П. Звонак, М. Лужанін, Я. Скрыган, Паўлюк Шукайла, Ядвіга Бяганская, Ніна Ватацы, А. Александровіч, сястра З. Бядулі Н. Плаўнік. Гэта ўсё была таленавітая моладзь. Сам паэт успамінае: «З пісьменнікаў майго пакалення я асабліва цесна пасябраваў у 30-я гады з К. Чорным, К. Крапівой і П. Броўкам.

К. Чорны і К. Крапіва былі маімі старэйшымі дарадчыкамі яшчэ на першых парах маёй літаратурнай дзейнасці. З П. Броўкам я пазнаёміўся крыху пазней, здаецца, у 1928 г., у час нашага навучання ва універсітэце, а праз некалькі гадоў мы сталі сябрамі — разам ездзілі ў калгасы і ў чырвонаармейскія часці, разам выступалі на літаратурных вечарах, разам праводзілі летні адпачынак, разам пісалі нават некаторыя творы. А ў час знаходжання ў Мінску мы часта збіраліся вечарамі ўчатырох, дзяліліся сваімі творчымі планамі, слухалі дасціпныя эпіграмы К. Крапівы, цешыліся з вясёлых расказаў К. Чорнага аб яго землякаў, гаварылі аб літаратуры і мастацтве, спрачаліся аб сваіх і чужых творах. Само сабой увайшло ўжо было нейк у традыцыю, што кожны з нас чытаў новы твор перш за ўсё у гэтым вузкім гуртку. Крытыка была таварыская, але глыбока прынцыповая, і мне асабіста яна шмат дапамагла ў маёй літаратурнай рабоце».

Пра студэнта Пятра Фёдаравіча Глебку ўспамінае яго аднакурсніца Ніна Барысаўна Ватацы. «Вучыліся мы без канікул, паступілі ў 1927 годзе і скончылі універсітэт у кастрычніку 1930 года. Гэта быў паскораны выпуск. Такім чынам, у адзін 1930 год адбылося два выпускі студэнтаў. На курсе вучылася таленавітая моладзь. Асабліва выдзяляўся Пятро Фёдаравіч Глебка. Гэта быў чарнявы, невысокага росту юнак з даволі прыемнымі рысамі твару. Апранаўся ён даволі сціпла і проста. Сядзеў Пятро Фёдаравіч заўсёды на апошнім месцы разам з Янкам Скрыганам, Паўлюком Шукайлам і Максімам Лужаніным. Сябры яго не заўсёды прысутнічалі на лекцыях, затое вялікай стараннасцю вызначаўся Пятро. За час вучобы нават не было такога выпадку, каб ён без прычыны прапусціў лекцыю. Глебка быў вельмі старанным у вучобе, добрым таварышам, вясёлым, сціплым і простым. Цікава яго было слухаць і на семінарскіх занятках, на якіх ён выступаў вельмі часта. Экзамены здаваў заўсёды з усімі, у чым рэзка адрозніваўся ад сваіх таварышаў. Пятра часта наведвала Ніна Бялькевіч — будучая жонка Пятра Фёдаравіча, якая вучылася ў педтэхнікуме. Жыў будучы паэт у інтэрнаце на Савецкай у адным пакоі з С. Дарожным. Вельмі любілі яго ўсе студэнты. Праўда, розныя літаратурныя плыні крыху раз'ядноўвалі студэнтаў...».

Вялікае ўздзеянне на фарміраванне літаратурных поглядаў юнака аказалі выкладчыкі. Сярод іх было многа цікавых і таленавітых людзей, якія былі ўлюбёны ў сваю працу, у свой народ і якія з любоўю аддавалі свае веды будучаму пакаленню — актыўнаму будаўніку новага жыцця.

Усё гэта не магло не аказаць уплыву на таленавітую моладзь, натхняла яе на вучобу і развівала яе талент. Усё гэта зрабіла Пятра Фёдаравіча паэтам, пра творчасць якога народны паэт БССР Якуб Колас сказаў: «Паэзія яго простая, сціплая і мужная». А гэта найвышэйшая ацэнка для творцы.

М. МІСЮЧЭНКА,
студэнтка IV курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

СУСТРЭЧА СА ШКОЛЬНІКАМІ

Вечар на тэму «Ленін і партыя ў беларускай паэзіі» адбыўся ў сярэдняй школе № 43 г. Мінска. З уступным словам перад вучнямі старэйшых класаў выступіў пісьменнік, дырэктар Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача Артур Вольскі. Ён расказаў пра слаўныя старонкі беларускай Ленініяны, падзяліўся творчымі задумамі тэатра на будучае.

Заслужаны артыст БССР Барыс Барысёнак прачытаў некалькі твораў пра Леніна. Вершы Пімена Панчанкі, Максіма Танка і іншых нашых паэтаў, прысвечаныя роднай партыі і яе неўміручаму правадыру — У. І. Леніну, чыталі вучні школы. Потым перад прысутнымі выступілі студэнты тэатральнага інстытута Любоў Міроненка, Віктар Міхайлаў і маладыя паэты-студэнты БДУ Валерый Шыханцоў, Людміла Забалоцкая і Ала Панкратава. Вучні школы цёпла падзякавалі гасцям за выступленне, уручылі ім кніжкі з надпісамі і кветкі.

ТРАДЫЦЫЯ ПРАДОЎЖАНА

У снежні мінулага года адбылася сустрэча першакурснікаў беларускага аддзялення філалагічнага факультэта са старшынёй секцыі паэзіі СП Беларусі Міколам Аўрамчыкам. А некалькі дзён назад да студэнтаў прыйшоў у госці празаік Іван Чыгрынаў.

Выкладчыкі Л. А. Царанкоў і Н. С. Мажэйка прадставілі пісьменніка і папрасілі яго расказаць аб сваёй творчасці, пра тое, як ствараўся раман «Плач перапёлкі», што новае мяркуе напісаць празаік у бліжэйшыя гады.

Іван Чыгрынаў адзначыў, што назва рамана «Плач перапёлкі» ў нейкай ступені пераклікаецца з плачам Яраслаўны. Ёсць тут пэўная сімволіка, якая падкрэслівае пераемнасць адносін чалавека розных стагоддзяў да вялікага гора — вайны.

— Спачатку я задумаў пісаць аповесць,—сказаў пісьменнік. — І нават паведаміў аб гэтым у часопісе «Полымя». Але ўжо ў час працы адчуў, што перарастаю рамкі, якія сам сабе вызначыў. Так атрымаўся раман. Праўда, і ён — толькі першая частка задуманага твора.

Іван Чыгрынаў паведаміў студэнтам, што раман «Плач перапёлкі» будзе надрукаван на рускай мове ў часопісе «Дружба народаў» у канцы гэтага года. Пісьменнік падпісаў студэнтам кніжкі, пажадаў ім поспехаў у жыцці і вучобе.

В. КАРПОВІЧ.

АЎТАРСКІ ВЕЧАР

На гэты раз у канцэртнай зале філармоніі на аўтарскі вечар вядомага беларускага пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўных прэмій СССР і БССР Івана Пятровіча Шамякіна сабралася шмат прыхільнікаў яго таленту. Былі сярод іх рабочыя і студэнты, вучні і ваенна-служачыя.

Своеасабліва пачалася сустрэча пісьменніка з чытачамі: на сцэну выходзяць героі твораў Шамякіна — Алёша Касцянок з «Крыніц», Пятро Шапятовіч і Саша Траянава з «Трывожнага шчасця», доктар Яраш і Шыковіч з «Сэрца на далоні», Антанюк і Лада са «Снежных зім»...

Вядомыя беларускія артысты Л. Рахленка, Б. Барысёнак, А. Астрамецкі, спявак В. Кучынскі, Т. Меансарава і іншыя дзеячы мастацтва былі ўдзельнікамі гэтага цікавага вечара.

Артысты Мінскага ТЮГа паказалі ўрывак з п'есы Шамякіна «Не верце цішыні», якая вось ужо 12 год ідзе з поспехам на сцэне гэтага тэатра. У выкананні артыстаў Брэсцкага тэатра імя Ленінскага камсамола Беларусі гледачы ўбачылі сцэну са спектакля «Сэрца на далоні» па аднайменнаму раману пісьменніка.

Па-майстэрску бліскуча прачытаў урывак з рамана «Снежныя зімы» народны артыст СССР Л. Рахленка.

А потым Іван Пятровіч расказаў чытачам аб сваёй творчай працы, аб тым, як задумваліся і пісаліся раманы і аповесці, аб новых пошуках і задумах, паведаміў, што пачаў пісаць п'есу аб вясковых настаўніках, што «выношвае ў галаве» сюжэт новага рамана аб жыцці сучаснага горада.

М. ЗУЕЎ,
студэнт І курса філфака

СОНЦА СПЕЛІЦЬ ВЯСНУ...

Марыя ЦІХАНОВІЧ

□ □

Зялёныя, гнуткія вербы
Ў блакіце нябёс прыгадаю.
Імкнуся да іх нясцерпна,
Лагодна галінку кранаю.
Расінка падзе на травы,
Нібы далікатны позірк.
Здаецца, шэпча ласкава
Пра салаўіны посвіст.
Давай прыгадаем разам
Водар краскаў у вечар,
Дзе вербы вячэрнім часам
Чакаюць нашай сустрэчы.

□ □

Суніцамі выспелі словы,
У зелені юнага сэрца.
І верас духмяны з дубровы
Радком, віючыся, кладзецца.

Бліжэй апускаецца неба,
Глядзіць праз бярозы і клёны.
Раса будзе дожджыкам
срэбным
Ляцець да ялін утрапёных.

Л. ЗАБАЛОЦКАЯ

Разгублена крочу па лесе,
Нібы ўсё пабачыла першай.
Плывуць незвычайныя песні,
І зноў нараджаюцца вершы.

І парастак кволы асіны
Здзіўляецца светламу промню.
Чароўным капытцам ласіным
Блішчэла ледзь бачная поўня.

Паліна ХАРЭВІЧ

□ □

Сонца спеліць вясну
На дзікіх ласіных сцежках...
Промень маланкаю
прамільгнуў, —
Сінькай ўзяліся пралескі.

Сонца спеліць вясну,
Воблакам горача ў небе,
Млее зямля, просіць ветра
дыхнуць
Мёдам з квітнеючых вербаў.

Сонца спеліць вясну
На вуснах промняў гарачых,
Хочацца птушкай удаль
сігануць,
Адбіцца ў вачах тваіх
сонечным зайчыкам.

Люба ТАРАСЮК

КАПЯЖЫ

Капяжы, капяжы!..
Зазвінелі, як тонкія струны...
Лес, здаецца, ажыў —
Па-вясенняму светлы і юны.

Капяжы, капяжы!..
Срэбрам льюцца у сінім
бясхмар'і —
У юнацкай душы
Звоняць песняй шчаслівай
і марай.

Капяжы, капяжы!..
Сэрца поўна святла і надзеі.
Хаця сам малады —
Яшчэ больш, яшчэ больш
маладзееш!..

Валянціна ХАМЧУК

□ □

Калі загарацца ад сонца вясны
Пахучыя свечкі каштанаў,
Нягоды забудзь, як нядобрыя
сны,
Прыдзі да мяне на світанні.

Навокал — зары аб табе
напамін,
Маўчаць задуменныя плёсы.
Я столькі чакала, што
ў светлы бурштын
Ператварыліся слёзы.

ДОБРЫ ДЗЕНЬ, АПЕРЭТА!

Калі прынята гаварыць, што наведванне тэатра павінна быць святам, то для многіх мінчан яно цудоўнае ўдвойне, калі яны трапляюць на спектаклі Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі БССР. Для іх гэта не толькі знаёмства з пастаноўкай, але і знаёмства з новым тэатрам. І кожны вечар, кожны новы паток гледачоў, уважлівых і патрабавальных, чакае сваёй сустрэчы з «навароджаным». Які ён!

Радасць адкрыцця новага тэатра падзяляюць усе. Яго першыя тры спектаклі: гераічная музычная камедыя беларускага кампазітара Ю. Семянякі «Пяе «Жаваранак», аперэты «Фіялка Манмартра» І. Кальмана і «Вольны вецер» І. Дунаеўскага цёпла сустрэты гледачамі. Поўная светлага аптымізму першая пастаноўка, вельмі лірычная другая, тэмпераментная і імклівая трэцяя. І, да таго ж, адчуваюцца вельмі сур'ёзныя намаганні ў спектаклях — ад дэкарацый да акцёрскай манеры.

Які ж напрамак гэтых намаганняў? Аўтары дабіваліся, каб замест аперэтачных штампаў былі жывыя характары, каб падзеі адлюстроўвалі сапраўднасць, каб сюжэт развіваўся па сваёй унутранай логіцы — і ўсё гэта ў традыцыйнай аперэтачнай весялосці, музыкальнасці, задоры. І тут нешта ўдалося, а нешта і не зусім.

Што можна сказаць аб аперэтах «Вольны вецер» і «Фіялка Манмартра»! Перш за ўсё тое, што праца рэжысёраў - пастаноўшчыкаў В. Д. Вярбоўскай і заслужанага дзеяча мастацтваў УССР А. С. Барсегяна дала добрыя вынікі. Яркая, жывая пастаноўка да самага канца трымае гледача то ў радасным настроі, то ў сваім асаблівым аперэтачным суме, урэшце ўсё роўна шчаслівым.

Усім добра вядомая чараўнічая музыка кампазітараў-класікаў, якая з'яўляецца як бы стрыжнем дзеяння, гарманічна спалучаецца з выканаўчым майстэрствам акцёраў. Свежыя маладыя галасы, тонкая музыкальнасць салістаў прыносяць многа прыемных хвілін.

Пяшчотная, незвычайна лірычная Стэла ў «Вольным ветры». Артыстка Н. В. Гайда змагла адшукаць для сваёй гераіні іменна тыя, самыя патрэбныя рысы, якія малююць вобраз гэтак тонка, прыгожа. Яе прывабны сакавіты голас дапаўняе ўражанне ад акцёрскага майстэрства маладой выканаўцы.

Запамінаюцца вобразы, створаныя артыстамі Р. І. Курлыкавай, В. В. Бурцавым, Е. Н. Ажэрэльевай. Менш удала, на мой погляд, праявіла сябе галоўная гераіня аперэты «Фіялка Манмартра» — Віялета (Л. І. Папова). І ў развіцці сюжэту, і ў сцэнічнай інтэрпрэтацыі яна ўсё ж застаецца «шэрым верабейчыкам». Не да канца вычарпала сябе артыстка ў абмалёўцы вобраза, вельмі малы запас магчымых выяўленчых сродкаў, няпоўнае праяўленне пачуццяў і эмоцый.

Але падрабязней хочацца спыніцца на пастаноўцы гераічнай камедыі «Пяе «Жаваранак». Упаўне апраўданы зварот аўтараў да гераічнага мінулага нашага народа. Выбран цікавы сюжэт, які дае магчымасць глыбокага і ўсебаковага развіцця ідэі ў спалучэнні з музычнай распрацоўкай.

Музыка Ю. Семянякі добрая: лёгкая, даступная, прасякнута інтанацыямі нацыянальнага беларускага меласу. П'еса гэтую музыку не забівае і нават наадварот. Але ж тут жанр не чыста музычны, і трэба лічыцца і з літаратурнай асновай. А яна ж якраз прымушае жадаць лепшага (тэкст Н. Ф. Калаптур, вершы П. А. Харкова). І справа тут не ў прыдзірцы да лексікі. Парушана неабходная прапорцыя ў раскрыцці дзвюх сіл—савецкіх людзей, партызан і фашыстаў. Развіццё сюжэту на пастаянным супрацьпастаўленні дабра і зла, любві і нянавісці, радасці і гора патрабуе дакладнай расстаноўкі акцэнтаў на кожны персанаж. Таму тут прэтэнзіі трэба аднесці і рэжысёру-пастаноўшчыку В. І. Ажэрэльеву.

Вобраз артысткі Ірыны, партызанскай разведчыцы, вызначае асноўную сюжэтную лінію спектакля. Каларытнымі, пераканаўчымі фарбамі малюе Д. І. Іванова, заслужаная артыстка БССР, сваю гераіню. Яе пранікнёная «Песня жаваранка» з'яўляецца лейтматывам усёй пастаноўкі, усхваляванa пераклікаецца з лёсам савецкай дзяўчыны. Пластычнасць і элегантнасць манеры выканаўцы, прыгажосць голасу робяць гэты вобраз яшчэ больш цікавым.

Трэба аддаць належнае майстэрству артыста Ю. Лесева ў выдатна выкананай ім арыі Дзмітрыя «Зразумець мяне», ва ўдачна праведзеным дуэце з Ірынай, калі нечакана сустрэліся яны ў доме Пятра Бусла. Запамінаецца ігра заслужанай артысткі БССР Е. П. Маціcавай у ролі бабкі Макрыны.

І ўсё ж хочацца падкрэсліць, што для мінчан, пакланнікаў аперэты, гэтыя новыя пастаноўкі даражэй за ўсе іншыя. Інакш і не ацэніш, калі меркаваць па тых цёплых і добразычлівых адносінах да ўсяго, што адбываецца на сцэне. І гэта да многага абавязвае артыстаў, пастаноўшчыкаў, увесь калектыў тэатра.

Цёплых слоў заслугоўвае выканаўчае майстэрства хору (хормайстар Н. В. Андросава), а выступленні балетнай трупы (балетмайстры Н. Ф. Красоўскі і Э. Ф. Пінно) можна назваць упрыгожаннем спектакляў. Як і хор, танцавальныя пастаноўкі арганічна ўплятаюцца ў сцэнічнае дзеянне. Задорная полька ў спектаклі «Пяе «Жаваранак», імклівая «Карамбаліна» ў аперэце «Фіялка Манмартра», «Вясельная» ў «Вольным ветры» фарбамі свайго мастацтва расквечваюць агульны фон пастановак. І, вядома, высокай пахвалы заслугоўвае аркестр пад кіраўніцтвам галоўнага дырыжора тэатра, заслужанага артыста БССР П. М. Кірыльчанкі — аднаго з галоўных удзельнікаў кожнага прадстаўлення.

Л. СІЛІНА,
студэнтка IV курса вячэрняга аддзялення журфака.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Тыраж 2000 экз. Зак. 565. АТ 09206